Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(57), 2009

*УДК 881.161.3*

# “Не выбіраем мы Радзімы…”

В. К. Шынкарэнка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вядома, што філасофска-экзістэнцыйнае асэнсаванне свету і чалавека творчай асобай непасрэдна звязана з уражаннямі дзяцінства і юнацтва, наогул малой радзімай, жыццёвымі вытокамі, зварот да якіх – у думках і наўпрост – заўжды жывіць натхненне, не дазваляе забыць спевы жаўрука, высекчы слязінкай вершы [1, с. 3]. Менавіта таму без азнаямлення з мастацкімі здабыткамі прадстаўнікоў свайго рэгіёнау не ўяўляецца магчымым дасягнуць неперарыўнасці, цэласнасці ў спасціжэнні багацця ўсёй нацыянальнай літаратуры.

Галіна Аляксандраўна Рагавая (нар. у 1943 г. у Добрушы) – выпускніца філалагічнага факультэта Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. П. Чкалава (1961–1966) – пераканана, што няма паэта без радзімы. Яе асабістая цікавасць да літаратурнай творчасці выявілася яшчэ ў школьныя гады. Але больш удумліва аднесціся да літаратурных практыкаванняў, стала ўзяцца за пяро яе падштурхнула заўсёднае перажыванне, нястомнае ўслухоўванне ў чароўнае і прыцягальнае гучанне вершаваных і празаічных радкоў класікаў айчыннай і сусветнай літаратуры пры іх прафесійным выкладанні на ўроках беларускай мовы і літаратуры ў Каранёўскай СШ Гомельскага раёна. Вершы Г. Рагавой рэгулярна з’яўляліся на старонках рэспубліканскага друку. Некаторыя з іх увайшлі ў такія калектыўныя зборнікі, як “Вуліца настаўніцкая” (2004), “Святло шчымлівай памяці” (2006), “Шматгалоссе Палесся” (2007). У 2006 г. асобным выданнем убачыў свет паэтычны зборнік Галіны Аляксандраўны “Роздум”. Лірыку пісьменніцы найперш вылучае жаданне перадаць на паперы бязмежнасць уласнае любові, неўдаваную, шчырую павагу да тутэйшых людзей і мясцін, што сталі бясконца роднымі, заўсёды даюць сілы, поўняць радасцю і дзіўным спакоем сэрца. ”Усюды ты – заезджы госць, / І толькі тут заўсёды дома…” (“У кожнага куточак ёсць” [2, с. 7]).

Творчасць Г. Рагавой вылучаецца свежым успрыманнем добра знаёмых кожнаму чалавеку вобразаў, шчырасцю, глыбінёй пачуццяў, здольнасцю перадаваць музыку самога жыцця і яго асобных праяў. Яе лірычная гераіня нястомна ўглядваецца-ўслухоўваецца ў разнаквецце, шматфарбнасць свету, баючыся прапусціць у багацці яго выяўлення штосьці асабліва важнае, тое адначасова значнае і знакавае, што дасканала створана Вечным Майстрам і дазволіць ёй хоць крыху наблізіцца да разгадкі нікім не разгаданай вышэйшай задумы ўпарадкавання існага.

На асенніх палях і гародах,
Там, дзе рэшткі травы і асця,
Усё паўней я ад году да году
Мудры сэнс разумею жыцця
(“На асенніх палях і гародах” [2, с. 29]).

Нечакананае адступленне ў фінале верша ад традыцыйнага тлумачэння суму асенняй зямлі з-за хуткага надыходу зімы, замена яго прычыны звычайнай чалавечай стомленасцю, а гэта ж тады, калі яшчэ столькі работы не даведзена да ладу, і нараджае сапраўдную паэтычную знаходку, ураўнаважвае прыродны і працоўны каляндар, стварае праз прыхаваны паралелізм персаніфікаваны вобраз зямлі-жанчыны. Абрысы яе адквітнелага аблічча ўвасабляюцца праз лініі палёў і агародаў, рэшткі травы і асця, маршчыны пустой раллі, дзе “расінка слязою іскрыцца”, а таксама далеччу прастораў, іх “светла-шэраю сумнай смугой”.

Неабходна заўважыць, што тэматыку вершам Г. Рагавой падказвае само жыццё, прырода (“Восень”, “Суніцы” і інш.). Якраз з’явы навакольнага асяроддзя, іх зменлівасць, узаемапераход найперш вучаць філасафічнаму асэнсаванню быцця, даюць магчымасць пераканацца ў хуткаплыннасці часу, адначасова ўсёстваральнага і разбуральнага, здольнага закалыхваць заўтрашнімі абяцанкамі і ў нейкі момант забіраць, нішчыць без усялякага папярэджвання (“Раніца ў лесе”).

Пры ўсёй безлічы вершаў, прысвечаных у айчыннай паэзіі вобразу маці, думаецца, не застанецца незаўважанай і “Мама” Г. Рагавой. Пры ўзнаўленні і апісанні самага дарагога для яе чалавека аўтарам зусім не выкарыстоўваюцца шырока распаўсюджаныя ў дадзенай тэматычнай разнавіднасці лірыкі гучныя інтанацыі, паэтызмы, памяншальна-ласкальныя формы, вялікая колькасць зваротаў і інш. Мацярынская любоў да дачкі перадаецца толькі праз аднаслоўны, аформлены па прынцыпе антанімічнага кантрасту, пералік тых спраў, што рабіліся ёю, каб толькі атуліць гераіню верша ад жыццёвых выпрабаванняў, прынесці палёгку ва ўсім. Таму і заўжды выбірала матуля “сабе – спякоту, мне – цяпло”; “сонца – мне, сабе – мароз”; “сабе лівень, мне – чысціню вільготных траў”. Як шкада, што ўсю бязмежнасць такой самаахвярнай любові кожны з нас спасцігае толькі разам са стратай мацярок, тады, калі нас, безахоўных, асірацелых, адразу заўважна пастарэлых, пад тым жа самым небасхілам, але ўжо без іх, бязлітасна пачынаюць апякаць “…іскры / Жыцця няўмольнага агню” [2, с. 30].

Відавочна, што ў сваёй творчасці Галіна Аляксандраўна арганічна выяўляе ўласную жаночую сутнасць, ніколькі не хварэючы на крайнасці феміністычных вольнасцей, не баючыся быць недасканалай, слабай, самой сабой. У гэтай сувязі цалкам натуральным падаецца выкарыстанае ёю ў вершы “***Мне голас незапісаных радкоў…” разгорнутае параўнанне з’явы напісання мастацкага твора з нараджэннем дзіцяці як аднолькава асвечаных жыццястваральным агнём духу.

Не пішацца. І раптам з небыцця
Радок за думкай шпарка паімчыцца.
Так, пэўна, нараджаецца дзіця,
Як час яму прыходзіць нарадзіцца [2, с. 51].

Увогуле, пры знаёмстве з паэзіяй Г. Рагавой узнікае ўражанне, што асобныя вершы яе, арганічна спалучаючыся між сабой, утвараюць адзіны і цэласны твор-узор, маляўнічую карціну. Спрабуе свае сілы пісьменніца і ў прозе (“Музыка вясны”). Часта выступае ў раённым і абласным друку з рэцэнзіямі, водгукамі на творчасць паэтаў-землякоў. Прыязна і цёпла напісана ёю “Песня аб Беларусі”, прысвечаная творчасці М. Башлакова. Маючы за плячыма важкі педагагічны вопыт, Галіна Аляксандраўна імкнецца падзяліцца сваімі думкамі і назіраннямі, раіць і папярэджвае аб магчымых памылках тых, хто толькі збіраецца пачаць працу на літаратурнай ніве. Яе ўласная лірыка чуйная да праблем сённяшняга дня, ненавязліва скіравана на выхаванне тых лепшых пачуццяў, якімі і павінен быць надзелены самапатрабавальны чалавек, сапраўдная асоба. Строгая не толькі да іншых, а найперш да сябе, Г. Рагавая пакутуе ад няспраўджанасці жаданага ў творчасці, неадшуканасці самага вартага, непаслухмянасці слова-матэрыялу, яго супраціўлення пачуццям, таемнасці творчаму агню. Але якраз у гэтай слабасці, разгубленасці Г. Рагавой перад Яго Вялікасцю Словам, наогул Паэзіяй і праступае, высвечваецца жарынка сапраўднага таленту і ўзнёсласці натуры самой аўтаркі.

Яшчэ адна наша зямлячка Ганна Мікалаеўна Атрошчанка (нар. у 1949 г. у в. Чырвоны Рог Добрушскага раёна), якая родам “з самых лепшых на свеце мясцінаў” [1, с. 24], пачала друкавацца з 1963 г. Яе асобныя творы былі апублікаваны ў калектыўных зборніках “Магістраль-92” і “Магістраль-94”. Першы зборнік “Асеннія мары” (1995) выдадзены з прысвячэннем маці. Менавіта яна разам з бабуляй Марыяй, гэтай мудрай сялянкай, выхавала ў дзіцячай душы будучай пісьменніцы спагадлівасць і чуласць да людзей, усяго жывога, адкрываючы невымерныя глыбіні быцця. Маючы за прыклад душэўнасць і дабрыню сваіх дарагіх жанчын, Г. Атрошчанка заўжды імкнецца быць такой жа спагадлівай, пяшчотнай, шчырай і трапяткой, як і яны. У гэтым пераконвае верш «Дзіцчы»:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А я, зняверaная, веру,
Што свет напоўнен дабрынёй,
Я адчыню шырока дзверы,
Каб прадказаць сустрэчу з ёй [3, с. 21].

Сярод асноўных матываў паэзіі аўтаркі пераважаюць любоў да роднага краю, апяванне прыгажосці такой прыцягальнай і дарагой Добрушскай зямлі. З першых свядомых жыццёвых крокаў скіраваная на дабро, сардэчную цеплыню і спагадлівасць, сваё духоўнае і эстэтычнае крэда Ганна Мікалаеўна вызначыла яшчэ ў “Асенніх марах”: “У прыроды цярплівасць / пазычу, / Каб і ўвосень спявала душа…” [1, с. 16]. Ды і пазней душа пісьменніцы тонка рэагуе на кожную праяву разнастайнага і шматаблічнага прыроднага і чалавечага свету, не прымае фальшы, ліслівасці, выводзіць дабрыню і чысціню чалавечых адносін як першаўмову ўсяго зямнога ўпарадкавання, дзе заўжды, у гэтым можна не сумнявацца, “Самоту пераможа / Мелодыя жыцця!..” [1, с. 6].

Жыццёвыя шляхі-дарогі Ганны Мікалаеўны не заўсёды былі роўнымі. Адукацыю працягнула ў будаўнічым вучылішчы, потым з ахвотаю і ўласцівай ёй ва ўсім стараннасцю вучылася ў тэхнікуме. Пасля яго заканчэння шчыравала звеннявой аддзелачніцай на будоўлі ў Тальяці. Але сум па маці, малой і вялікай радзіме не давалі прырасці да чужога краю. Не прыцягвалі і царэўна-Волга, Жыгулёўскія горы. Хацелася чуць родную мову, песні, захапляцца роднымі краявідамі. І Г. Атрошчанка вяртаецца дамоў, працуе на будоўлі і адначасова вучыцца ў вячэрнім універсітэце пры газеце «Гомельская праўда», дзе ў асноўным набывалі адукацыю пазаштатныя аўтары.

У свет выйшлі такія кнігі паэзіі Г. Атрошчанка, як “Споведзь душы” (1996), “Родныя мясціны” (1998), “Чырвоны Рог” (2000), “Сустрэча” (2002), “Летуценніца” (2006). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага Саюза журналістаў, Г. Атрошчанка працуе ў розных публіцыстычных жанрах, у галіне паэзіі і прозы. Лірыка пісьменніцы кранае сваёй чысцінёй, яна пранізліва светлая, адкрытая. Невыпадкова на некаторыя вершы Галіны Мікалаеўны напісана музыка, яны сталі песнямі, рамансамі. Мастацкі густ паэткі дазваляе перадаць тонкі душэўны стан яе лірычнай гераіні, ненавязліва паразважаць пра таямніцы кахання, дзе з дваіх часцей за ўсё толькі адзін шчаслівы (“Заява”). Але нават і згубіўшы ключы ад шчасця, гераіня пісьменніцы ўмее адчуваць хараство любага і свету, бясконца радавацца кожнай праяве яго як непераўзыйдзенай дасканаласці (“Летуценніца”).

Я летуценніца, летуценніца…
У чым, скажыце, тут віна?
Хай мары зорачкамі сцелюцца,
Калі на вуліцы зіма [3, с. 12].

Удаюцца Г. Атрошчанка і празаічныя творы, асобныя сюжэтныя хады і прыёмы вобразастварэння якіх цесна звязаны з фальклорнай паэтыкай, з тымі незабыўнымі крыніцамі народнай творчасці, што запалі ў душу з дзяцінства. У аснове ж большасці тэкстаў журналісткі і пісьменніцы канкрэтныя назіранні, рэальныя прататыпы, жыццёва верагодныя здарэнні, з’явы, камічныя эпізоды і г.д. Зборнікі прозы “Жытнёвыя каласы” (1999), “Сустрэча” (2002), “Жыццёвая гісторыя” (2004) Г. Атрошчанка прадстаўлены рознажанравымі замалёўкамі, абразкамі, невялікімі па аб’ёме апавяданнямі. Ідэйна-вобразныя і моўныя адметнасці гучання такіх твораў, як “Цыганскае вяселле”, “Кулага” і іншыя ўзмацняюцца прыказкамі і прымаўкамі, трапнымі народнымі выслоўямі. Сабраныя пад адной вокладкай творы ўзнаўляюць непаўторны каларыт вясковага жыцця, заўважыць і дэталёва перадаць які можа толькі чуйная асоба, сапраўдны вясковец. А гэта якраз і ўдаецца пісьменніцы, якая шчыра любіць сваю Радзіму, арганічна адчувае вёску, назаўжды паяднана з ёй каранямі-вытокамі. Акрамя таго, паэзіі і прозе Г. Атрошчанка ўласціва вострае адчуванне сучаснасці, клопат аб захаванні і памнажэнні сённяшнім пакаленнем маральных традыцый, духоўных набыткаў папярэднікаў. Уся сэнсава-эмацыянальная скіраванасць твораў, іх стылістыка і вобразна-выяў-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ленчы лад падкрэсліваюць сур'ёзнасць намераў пісьменніцы, за плячыма ў якой "…тыя крылы, Што ўздымаюць нас штодня" [3, с. 26]. Улюбёная ў акаляючую рэчаіснасць, людзей насуперак усім нялёгкім жыццёвым выпрабаванням, здольная заўважаць "звонкія матывы" наваколля, "расінак светлых пералівы", вуснамі сваёй лірычнай гераіні Г. Атрошчанка выяўляе геданістычны тып светаадчування, услаўляе райскі прыродны пачатак:

Ты зачаруй мяне раздоллем,
Пяшчотай ціха затулі,
Каб толькі весела і вольна
Гулі вясёлыя чмялі.
("Прыродзе" [3, с. 8])

У пісьменніц нашага краю шмат творчых задум. Акрыленасць натхненнем, любоўю да бацькоўскай зямлі ("Не выбіраем мы радзімы – / Яна сама гадуе нас" [3, с. 91]), нястомнае памкненне да зведання і выхавання душ (паводле У. Караткевіча) дапамагае ім і сёння спорна працаваць, не спыняцца на дасягнутым.

**Abstract.** In the paper the possibilities of comprehension of the national are considered through the appeal to the regional on the example of G. Rogova's and A. Atroschenko's works.

### Літаратура

1. Атрошчанка, Г. Асеннія мары: Вершы / Ганна Атрошчанка [Тэкст]. – Гомель: "Полеспечать". – 24 с.
2. Рагавая, Г. Роздум / Галіна Рагавая [Тэкст]. – Гомель: Барк. – 58 с.
3. Атрошчанка, Г. Летуценніца / Ганна Атрошчанка [Тэкст]. – Гомель: Барк, 2006. – 68 с.
4. Рагавая, Г. *** Зямля мая! Мой кут адзіны! // Святло шчымлівай памяці [Тэкст]: зборнік вершаў паэтаў Гомельшчыны / уклад. М. А. Беразоўская. – Гомель: ТДА "Барк", 2006. – 246 с. – С. 89 – 91

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 9.03.09

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ